# НАШ ВЫБАР – БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Яна мілагучная і прыгожая. Яе нельга не любіць, не паважаць, не карыстацца ёю, бо беларуская мова – найважнейшы элемент нашай нацыянальнай духоўнай культуры.

Мае адносіны да роднай мовы былі і застаюцца самымі цёплымі, паважлівымі і беражлівымі. Любоў да беларускага слова з'явілася яшчэ ў школьныя гады дзякуючы выдатнай настаўніцы беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 1 г. Гарадка Алене Анатольеўне Кулаковай.

А цудоўныя музычныя кампазіцыі?! Слухаць не наслухацца!.. Да таго ж я вельмі люблю прыязджаць у госці да сваіх дзядулі і бабулі і атрымліваць асалоду ад іх самабытнай гаворкі. Вось дзе адчуваеш сябе сапраўдным беларусам! Гэта я ўсё да чаго: у кожнага чалавека ёсць свае прычыны любіць родную мову. Цікава, а якія яны ў дзяўчат філалагічнага факультэта, што абралі спецыяльнасць «Беларуская філалогія. Літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць»? І чаму менавіта тут яны вырашылі вучыцца?

**Надзея Радзеўская, студэнтка 2-га курса:** «Для мяне беларуская мова – нешта асабістае, блізкае і роднае. А філалогія – гэта не толькі мова і літаратура, але і гісторыя, абрады, традыцыі і звычаі нашых продкаў. Я абрала гэтую спецыяльнасць, каб яшчэ глыбей пазнаёміцца з нацыянальнай культурай».

**Анастасія Фралова, студэнтка 2-га курса:** «Я патрыётка сваёй краіны, а калі адчуваеш сябе беларускай, то мову сорамна не ведаць».

**Кацярына Лабецкая, студэнтка 2-га курса:** «Мне заўсёды падабалася родная мова. І вучылася я ў беларускамоўнай школе. Таму выбар спецыяльнасці быў для мяне відавочным».

**Ірына Радзіхоўская, студэнтка 3-га курса:** «Мне падабаецца мая спецыяльнасць. З аднаго боку, я вывучаю родную мову, а з другога – мяне прываблівае прафесія журналіста, які заўсёды ў цэнтры падзей».

**Алеся ВАРКУЛЕВІЧ,**
**студэнтка 2-га курса ФлФ.**